ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАУ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАУНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 36 (672) | Аўторак, 15 снежня 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ПАДЗЕЯ ГІСТАРЫЧНАГА ЗНАЧЭННЯ

**На мінулым тыдні савецкія людзі, усё прагрэсіўнае чалавецтва з вялікай увагай сачылі за візітам Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова ў Злучаныя Штаты Амерыкі. Яго сустрэчы з прэзідэнтам ЗША Р. Рэйганам, іншымі дзяржаўнымі дзеячамі і грамадскасцю гэтай краіны, падпісаны дагавор аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай дальнасці, абмеркаванне важных пытанняў сучаснасці знайшлі самы шырокі водгук ва ўсім свеце. Людзі, якія імкнуцца да міру, поўнага раззбраення і ўзаемаразумення, горача вітаюць першыя крокі, зробленыя ў гэтым напрамку ў ходзе гістарычнага візіту.**

### ЦЯПЛО РАЗРАДКІ

Цяжка нагадаць падзею, за якой бы з такой увагай і цікавасцю сачылі ва ўсім свеце, як за візітам Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова ў Злучаныя Штаты Амерыкі. Да пачатку яго сустрэч з прэзідэнтам ЗША Р. Рэйганам не думалася, што яны будуць праходзіць у такой цёплай абстаноўцы і ўзаемаразуменні ў справе вырашэння многіх праблем. Натуральна, паміж СССР і ЗША, краінамі з рознымі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі сістэмамі, існуе яшчэ цэлы рад істотных разнагалоссяў. Але імкненне з абодвух бакоў знайсці канструктыўнае рашэнне галоўнай праблемы — праблемы захавання міру і паступовага ўсеагульнага раззбраення — усяляе адчувальны аптымізм. Мы яшчэ раз пераканаліся ў тым, што нават самыя складаныя пытанні можна вырашаць мірным шляхам ў ходзе зацікаўленых перагавораў. Падпісаныя ў Вашынгтоне дакументы радуюць нас і натхняюць. Усе мы бачым, як ў людзей прыбавілася настрою, расце іх актыўнасць ва ўсіх сферах дзейнасці — працы, вучобе, грамадскім жыцці.

**А. ФЯСЬКОЎ,**
**дацэнт кафедры філасофіі.**

### ЛЕПШ СПАБОРНІЧАЦЬ У СПОРЦЕ

Сёння мне хочацца сказаць вось аб чым. СССР і ЗША з'яўляюцца вядучымі дзяржавамі не толькі па свайму эканамічнаму, ваеннаму патэнцыялу, але і ў спорце. Цалкам падтрымліваю спаборніцтва ў эканоміцы, на спартыўных арэнах, і ні ў якім разе — у гонцы ўзбраенняў. Яго непамернае накапленне пагражае небяспекай знішчэння ўсёй нашай цывілізацыі. Таму не можа не радаваць падпісаны ў Вашынгтоне М. С. Гарбачовым і Р. Рэйганам дакумент аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай дальнасці. Гэты першы крок да ўсеагульнага раззбраення з глыбокім задавальненнем успрынялі не толькі савецкія людзі, але і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва. Жыць у міры без страху за сваю будучыню і будучыню новых пакаленняў — наша самая запаветная мэта. Яе ажыццяўленню пачатак пакладзены!

Кожны савецкі чалавек зацікаўлены ва ўмацаванні ўзаемавыгадных сувязей з амерыканскім народам. Мы імкнемся да дружбы, да таго, каб змагацца за новыя рэкорды і на спартыўных арэнах.

**Б. ЗАЙЦАЎ,**
**дэкан факультэта фізічнага выхавання.**

### НА КАРЫСЦЬ ЧАЛАВЕЦТВА

Нялёгка перадаць тыя пачуцці, з якімі кожны з нас сачыў за ходам візіту Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова ў ЗЩА. Мы пераканаліся, што ў сваёй пераважнасці амерыканскі народ таксама вельмі шчыры і дружалюбны, праяўляе рашучасць у тым, каб захаваць на планеце мір. Менавіта ад таго, як будуць вырашацца ўзаемаадносіны паміж нашымі дзвюма краінамі, залежыць будучыня ўсяго чалавецтва. Нельга не радавацца таму, што ў гэтых узаемаадносінах наступіла пацяпленне. Нарэшце, мы па-сапраўднаму адчулі: на змену канфрантацыі, былога часу «халоднай вайны» прыходзіць стабілізацыя ва ўзаемаадносінах вядучых дзяржаў дзвюх сацыяльных сістэм, вядзецца пошук шляхоў у вырашэнні самых важных і хвалюючых праблем нашых дзён.

**У. СМІРНОЎ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ ГДУ.**

### УДЗЯЧНЫ

...8 снежня 1987 года. Гэта дата стала гістарычнай падзеяй. Яна з'яўляецца важнай вяхой на шляху да ўсеагульнага раззбраення, усталявання трывалага міру.

Мы добра ведаем, якія велізарныя сродкі цяпер трацяцца на гонку ўзбраенняў. Спыненне яе, рэзкае змяншэнне асігнаванняў на гэтыя мэты створаць магчымасць значна больш рэсурсаў накіроўваць на павышэнне дабрабыту людзей не толькі сваіх краін, але і тых дзяржаў, якія сталі на шлях самастойнага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Мы, сённяшнія студэнты, ведаем пра жахі вайны па кнігах, кінафільмах, тэле- і радыёперадачах. Усім сэрцам жадаем аднаго: каб больш яны не паўтарыліся ніколі. Шчыра ўдзячны Камуністычнай партыі, Савецкаму ўраду за іх паслядоўную знешнепалітычную міралюбівую палітыку, асабіста Генеральнаму сакратару тав. М. С. Гарбачову, які столькі намаганняў прыкладае для таго, каб забяспечыць мірнае суіснаванне дзвюх сацыяльных сістэм. На кожны зрух у гэтай высакароднай справе мы павінны адказваць яшчэ больш паспяховай вучобай і павышэннем сваёй грамадскай актыўнасці.

**Г. МАТОРАНКА,**
**сакратар камітэта камсамола эканамічнага факультэта, дэпутат раённага Савета.**

**Працягваючы размову на тэму: «Які ён, наш сучаснік?», пачатую ў газеце «Гомельскі універсітэт» 13 кастрычніка г. г. членам савета ветэранаў вайны і працы ГДУ дацэнтам кафедры тэарэтычнай фізікі У. Р. Сіманавым, ёсць сэнс закрануць мноства праблем студэнцкай моладзі. Гэта — іх адносіны да вучэбных абавязкаў, прафесіянальная падрыхтоўка, узровень і змест духоўных запатрабаванняў, самакіраванне і многае іншае, што знаходзіцца ў русле галоўнай задачы сённяшняга дня — перабудовы.**

## СТУДЭНТ І ПЕРАБУДОВА

Перабудова ў краіне — гэта своеасаблівы пробны камень прафесіянальнай, грамадзянскай, чалавечай прыгоднасці кожнага індывіда. Вышэйшая школа заклікана фарміраваць чалавечы фактар перабудовы, рыхтаваць спецыялістаў, якія вызначаюцца маральнай мабільнасцю, здольнасцю падтрымліваць прагрэсіўнае, успрымаць патрабаванні НТР, адчуваць патрэбы сучаснасці. «Кваліфікацыя, кампетэнтнасць кадраў і іх высокая грамадзянская адказнасць у многім вызначаюць маштабы і тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу, інтэнсіфікацыі народнай гаспадаркі, — падкрэсліваецца ў «Асноўных напрамках перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне». Ад таго, як студэнт успрымае перабудову ў ВНУ, у якой меры ён з'яўляецца ўдзельнікам праходзячых змен, залежыць і яго грамадзянская пазіцыя як спецыяліста ў недалёкім будучым.

Які ж ён, сённяшні студэнт? Што хвалюе яго, чым ён жыве, якія мэты ставіць перад сабой і як імкнецца дасягнуць іх?

Першачарговая задача перабудовы ў ВНУ — развіццё творчых здольнасцей будучых спецыялістаў пры іх самастойнай рабоце і ўкараненні актыўных форм і метадаў навучання. Студэнты вашага універсітэта, як сведчаць гутаркі з імі і анкетныя апытанні, ў большасці правільна ацэньваюць ажыццяўляемыя перамены ва ўдасканальванні навучальнага працэсу. Выкарыстаем даныя апытання студэнтаў чацвёртага курса спецыяльнасці АМАЭІ, якія ў пэўнай ступені адлюстроўваюць праблемы і цяжкасці перажываемага ў ГДУ перыяду. «Ваша ацэнка пачатай ва універсітэце перабудовы?» — на гэта пытанне пераважная больчасць студэнтаў адказала станоўча. Вось характэрная думка: «Вітаю імкненне скараціць час заняткаў. Калі не так стамляешся з-за «сядзення», з'яўляецца жаданне і магчымасць заняцца пытаннямі самастойна ў абстаноўцы, якая больш прыцягвае да спазнання навуковых ісцін».

Але ці ўсе студэнты гараць жаданнем заняцца самастойнай работай? Тут ёсць аб'ектыўныя цяжкасці: недастатковая колькасць падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, распрацовак, праграм вучэбных курсаў і іншай неабходнай літаратуры. Гэтыя адмоўныя моманты, якія праявіліся на першым этапе вузаўскай перабудовы, патрабуюць аператыўнасці ў рабоце бібліятэкі універсітэта, факультэцкіх вучэбна-метадычных камісій і кабінетаў кафедр, рэдакцыйна-выдавецкага аддзела ГДУ, выкладчыкаў. У арсенале апошніх — удасканальванне методыкі правядзення заняткаў, выкарыстанне творчых форм у вучэбнай рабоце, палемікі, дыскусіі, дыспута, максімальнае набліжэнне, цесная сувязь тэарэтычнага матэрыялу з сацыяльнай практыкай, праблемамі вытворчасці. Ад выкладчыка залежыць і арганізацыя пастаяннага кантролю за работай студэнтаў. «Неабходна, на маю думку, узмацненне або ўдасканальванне самастойнай работы студэнта» — такі адказ аднаго з удзельнікаў апытання.

Не менш важнае значэнне мае і сустрэчная актыўнасць, ініцыятыва студэнтаў у арганізацыі сваёй самастойнай работы, жаданне вучыцца, павышаць свой тэарэтычны ўзровень. Без перабольшвання можна сказаць: трэба новае мысленне і новы ўзровень адносін студэнтаў да вучэбнага абавязку. Не ўсе студэнты ўспрымаюць перамены, што адбываюцца цяпер, як узрастанне патрабавальнасці да вучэбнай дысцыпліны, павышэння асабістай адказнасці, арганізаванасці. Сёння асабліва значэнне набывае каэфіцыент карыснага дзеяння працалюбства і добрасумленнасці студэнта. Гэта добра разумеюць самі студэнты. «Перабудова ва універсітэце «адлюстравалася» толькі на непаспяваючых студэнтах. Хаця скарачэнне гадзін лекцый і павялічыла вольны час, але тыя, хто да гэтага рэгулярна займаўся, той і працягвае займацца, а той, хто «гуляў», «гуляе» і цяпер» — так мяркуе адзін з удзельнікаў апытання.

Такім чынам, выяўляецца слабае звяно — нежаданне часткі студэнтаў карыстацца «падаўжэннем» свайго вольнага часу, г. зн. самастойна працаваць, што тлумачыцца пасіўнасцю, абыякавасцю да вучобы, з аднаго боку, а з другога — недастатковым кантролем з боку выкладчыкаў.

Адказы на пытанне: «У чым вы бачыце прычыны пасіўнасці часткі студэнтаў у вучобе і грамадскай рабоце?» — менавіта і пацвярджаюць вышэй сказанае. Студэнты гавораць:

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

## ДЫКТУЕ ЧАС ПЕРАМЕН

### НА ПЛЕНУМЕ ЦК ВЛКСМ

Удзел у абнаўленні ўсіх бакоў жыцця грамадства, развіццё дэмакратыі і на справе ператварэнне саюза моладзі ў школу сацыялістычнага самакіравання — ключавыя задачы перабудовы ў камсамоле пасля яго XX з'езда. Аб гэтым гаварылася на пленуме ЦК ВЛКСМ, які адбыўся 7 снежня ў Маскве.

Зроблены першыя рэальныя крокі па расшырэнню самадзейнасці пярвічных арганізацый, усталяванню ў іх атмасферы дэмакратыі і публічнасці, адзначалася ў дакладзе першага сакратара ЦК ВЛКСМ В. Міраненкі і выступленнях. У той жа час накіраванасць моладзі да дзеянняў нярэдка натыкаецца на псіхалагічную і арганізацыйную непадрыхтаванасць некаторых камітэтаў ВЛКСМ да работы ў новых умовах.

Важнай задачай пленум лічыць пошук шляхоў развіцця ініцыятывы камсамольскіх арганізацый у вырашэнні сацыяльна-эканамічных задач, якія стаяць перад краінай ва ўмовах радыкальнай эканамічнай рэформы. Выступаўшыя падкрэслівалі, што размова ідзе аб тым, каб знайсці і ажыццявіць такія формы і рашэнні, якія змаглі б забяспечыць адзінства агульнанародных, калектыўных і асабістых інтарэсаў маладых працаўнікоў. Прыклады такога падыходу падаюць стваральнікі маладзёжных жылых комплексаў, энтузіясты навукова-тэхнічнай творчасці моладзі, члены гаспадарча-разліковых укараняльных і пасрэдніцкіх фірм, кааператываў.

У рабоце пленума ЦК ВЛКСМ удзельнічалі загадчык Аддзела будаўніцтва ЦК КПСС А. Р. Мельнікаў, намеснік загадчыка Аддзела арганізацыйна - партыйнай работы ЦК КПСС Н. А. Залатароў, іншыя адказныя работнікі ЦК КПСС, кіраўнікі рада міністэрстваў і ведамстваў.

(Кар. ТАСС).

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую педагагічную работу, падрыхтоўку маладых спецыялістаў, актыўную навуковую і грамадскую дзейнасць і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін **БАРАВІКОВА Ганна Міхайлаўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай рэктарата, парткома і прафкома універсітэта.

*НОВАЕ Ў ВУЧЭБНЫМ ПРАЦЭСЕ*

# ТЭЛЕЭКРАН—НАДЗЕЙНЫ ПАМОЧНІК

**У плане рашэння адной з галоўных задач вышэйшай школы, вызначаных у «Асноўных напрамках перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне» — павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Важнае значэнне тут мае пошук новых форм арганізацыі і эфектыўнага кантролю як за аўдыторнай, так і за самастойнай работай студэнтаў, што дазваляе актывізаваць іх пазнавальную дзейнасць на працягу ўсяго навучальнага года.**

На кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін апрабавана новая форма кантролю вучэбнай **дзейнасці студэнтаў, якая ўключае** як аўдыторную, так і самастойную працу ў міжсе**сійны перыяд у выглядзе кант**рольнай работы па раздзелах вывучаемай дысцыпліны з выкарыстаннем тэлевізійнай устаноўкі.

Сутнасць методыкі наступная. Пасля праслухоўвання лекцый і прапрацоўкі самастойна асобных пытанняў па аднаму або некалькіх раздзелах (у залежнасці ад аб'ёму і складанасці **раздзелаў) студэнтам даецца** тэрмін не менш тыдня для падрыхтоўкі да кантрольнай работы. Пры гэтым яны не атрымліваюць ніякіх пытанняў, а рыхтуюцца па матэрыялах лекцый, падручніках, вучэбных дапаможніках і па методыках, рэкамендаваных для самастойнай работы.

Для кантрольнага задання выкладчык рыхтуе пэўную колькасць асноўных пытанняў (у нашай практыцы іх 20) па матэрыялах вынесенага для праверкі раздзела дысцыпліны. Пры гэтым важным з'яўляецца дакладная фармуліроўка пытання з указаннем патрабуе**май формы адказу (напрыклад, «пералічыць» уласцівасці, функ**цыі і г. д., «даць вызначэнне», «прадставіць схему», «расшыфраваць азначэнні» і інш.). **Кантрольную работу выконваюць адначасова ўсе студэнты курса.**

Пры правядзенні кантрольнай работы пытанні паслядоўна па аднаму ўводзяцца ў экран тэлевізараў з указаннем часу для адказу. Для самакантролю за часам у экран адначасова ўводзіцца ўключаны секундамер. **Пры гэтым студэнт не перапісвае пытанні, а ставіць толькі іх парадкавыя нумары. У залежнасці ад складанасці пытання на адказ адводзіцца** ад адной да трох мінут. Па заканчэнні ўказанага тэрміну ў экран уводзіцца чарговае пытанне. У цэлым работа займае 30—40 мінут.

**Пасля адказу на апошняе** пытанне пісьмовыя работы здаюцца выкладчыку для праверкі, якую ён можа праводзіць у час кансультацый, вызначаных графікам на кафедры і ўключаных у гадзіны, якія адводзяцца на кіраўніцтва самастойнай работай студэнтаў.

Пры праверцы работы выкладчык не выпраўляе памылкі студэнтаў, а толькі адзначае няправільна дадзеныя адказы. **Гэтым самым прадастаўляецца магчымасць студэнту пасля атрымання назад сваёй работы не толькі самаацаніць уласныя веды, але і самастойна або з дапамогай выкладчыка ў гадзіны кансультацый прапрацаваць няправільныя адказы. Кантрольная работа** ацэньваецца з разлікам: на адзін бал — чатыры правільныя адказы. Так адзнака «выдатна» выстаўляецца пры правільных адказах на ўсе 20 пытанняў, чатыры— на 16, тры — на 12 пытанняў. Менш 12 правільных адказаў ацэньваюцца як нездавальняюча. Адзнакі работы заносяцца ў журнал і апавяшчаюцца ўсім студэнтам.

**Даная методыка спачатку была** апрабавана аўтарам гэтых радкоў у бягучым семестры. Такім чынам правяраліся веды студэнтаў 3-га курса біялагічнага факультэта па фізіялогіі чалавека і жывёлін. Затым, пасля правядзення адкрытай паказальнай кантрольнай работы на гэтым жа курсе для выкладчыкаў кафедры, методыка **ўкаранёна для кантролю ведаў** студэнтаў па цыталогіі, гісталогіі і анатоміі на біяфаку, па анатоміі і фізіялогіі чалавека — на факультэце фізічнага выхавання.

Цяпер адпала неабходнасць правядзення такіх малаэфектыўных форм кантролю ведаў студэнтаў як калёквіумы, разнастайныя рэфераты, справаздачы і інш.

Выкарыстанне ўказанай методыкі кантролю ведаў студэнтаў, як паказаў наш вопыт, актывізуе пазнавальную дзейнасць студэнтаў у міжсесійны **перыяд, абавязвае іх рэгулярна** і сістэматычна, з лагічнай паслядоўнасцю працаваць над матэрыялам дысцыпліны па раздзелах па меры іх вывучэння ў час аўдыторных заняткаў і самастойна, садзейнічае развіццю спаборніцтва паміж студэнтамі ў авалодванні ведамі. Вельмі важна, што ў выніку забяспечваецца аднолькавая патрабавальнасць і аб'ектыўнасць ацэнкі ведаў студэнтаў. **Гэта ў цэлым інтэнсіфіцыруе ву**чэбны працэс і павышае яго якасць.

Адметнай асаблівасцю данай методыкі з'яўляецца яшчэ і тое, што выкладчык пры праверцы адказаў студэнтаў мае магчымасць, у сваю чаргу, выявіць **тыя пытанні, якія ім, магчыма, былі недастаткова, дакладна** выкладзены на лекцыі, або слаба прапрацаваны самастойна студэнтам. На гэта звяртаецца асаблівая ўвага пры правядзенні кансультацый.

Пры наяўнасці аўдыторыі з тэлевізійнай устаноўкай прапа**ноўваемая намі методыка кант**ролю ведаў студэнтаў прыгодная практычна па ўсіх без выключэння дысцыплінах.

**А. КІЕНЯ,**
**загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін, доктар біялагічных навук.**

---

*Справы партгрупы*

# ...НЕ ЧАКАЮЧЫ ЭКЗАМЕНАЎ

На сходзе партгрупы кафед**ры алгебры і геаметрыі (самай** вялікай па колькасці членаў КПСС на матэматычным факультэце) абмеркаваны рад **пытанняў, звязаных з развіц**цём студэнцкага самакіравання, **арганізацыяй самастойнай** работы студэнтаў па дысцыплінах кафедры. Асабліва дэталёва прааналізаваны стан самападрыхтоўкі студэнтаў-перша**курснікаў. Камуністы адзначылі таксама, што ў старшакурснікаў адносіны да вучобы сталі больш** адказнымі. Яны прыходзяць на кансультацыі па напісанню курсавых і выкананню лабараторных работ. Паляпшэнню якасці арганізацыі самастойнай працы будзе садзейнічаць план і графік яе правядзення на семестр, у якім указваюцца тыднёвыя гадзіны на аўдыторныя заняткі па кожнай дысцыпліне, віды гэтых заняткаў, даты правядзення кантрольных работ, калёквіумаў.

Час патрабуе ад кожнага **камуніста павысіць эфектыў**насць вучэбнай работы, якая немагчыма без правільнай і дакладнай пастаноўкі ўліку бягучай дысцыпліны і паспяховасці студэнтаў. Улік студэнтаў і кантроль за іх работай з'яўляецца важным сродкам рэгу**лявання многіх паказчыкаў ву**чэбнага працэсу і сродкам кіравання якасцю навучання. Арганізацыя бягучага кантролю за работай студэнтаў становіцца адбіваецца на рытмічнасці іх заняткаў на працягу ўсяго семестра, садзейнічае павышэнню якасці ведаў.

Сход партгрупы сваім рашэннем абавязаў камуністаў дапамагчы актыву акадэмічных груп, замацаваных за кафедрай, арганізаваць кантроль за наведваннем студэнтамі заняткаў, захаваннем тэрмінаў выканання і здачы практычных і лабара**торных работ. Членам кафедры** рэкамендавана таксама наведваць інтэрнат з мэтай аказання канкрэтнай дапамогі студэнтам у наладжванні рэгулярнай вучэбнай работы, арганізацыі палітыка-выхаваўчых мерапрыемстваў.

**В. ЧАРТОК,**
**партгрупорг кафедры алгебры і геаметрыі.**

---

гачоў—Чачэрск да Чарнігава. Такую сітуацыю своечасова прадбачыў Кутузаў і прыняў неабходныя меры. Указаны напрамак прыкрылі Кіеўскае, Палтаўскае і Чарнігаўскае апалчэнні. Рагачоў і Чачэрск удалося вызваліць. Галоўныя сілы Дамброўскага заставаліся скаванымі і малаактыўнымі ў раёне крэпасці Бабруйск.

НАДЫШОЎ час канчатковай развязкі. Пасля цяжкіх баёў 3—6 лістапада (15—16 па новаму стылю) пад Красным Кутузаў даў для арміі аднадзённы адпачынак, адправіўшы наперад авангарды Міларадовіча, Платава і іншыя часці. Неабходна было скардынаваць дзеянні ўсіх трох групіровак і не дазволіць Напалеону вырвацца са стратэгічнага акружэння. Варта ўлічыць, што французскі палкаводзец далучыў да сябе сілы Удзіно, Сен-Сіра і іншых, таму яго армія, нягледзячы на вялікія страты, захоўвала баяздольнасць. Праўда, за ёй ішло да 40 тысяч салдат, якія адсталі ад сваіх часцей або з ліку разбітых. Кутузаў быў занепакоены тым, каб Напалеон не прарваўся ў Літву і не рушыў далей. Ён загадаў генералу Вітгенштэйну націснуць на правы фланг праціўніка, а адміралу Чычагову — выйсці да Бярэзіны і трывала ўтрымліваць абодва яе берагі.

У верасні-кастрычніку Чычагоў паспяхова дзейнічаў на паўднёва-захадзе Беларусі. Узначальваемыя ім войскі занялі Брэст, Пінск, Ваўкавыск, а затым рушылі ў бок Мінска і Барысава. Аднак яму не хапіла сіл, каб скаваць карпусы Рэнье і Шварценберга.

**У першай дэкадзе** лістапада Кутузаву стала вядома аб тым, што Напалеон праз Оршу ідзе на Барысаў прама ў лоб на Чычагова. Ён імкнуўся не дапусціць пераправы французаў праз Бярэзіну.

4 -га (16) лістапада адмірал Чычагоў авалодаў Мінскам і захапіў у горадзе буйныя харчовыя склады. Корпус Эртэля ў той жа час заняў Пінск. Гэта прымусіла Дамброўскага адвесці свае войскі да Барысава. Аднак з-за некаторых пралікаў і пэўнай нерзваротлівасці рускіх ваенанальнікаў яму першаму ўдалося авалодаць гэтым горадам. І ўсё ж неўзабаве праціўнік быў выбіты з Барысава. Гэты горад набыў выключнае стратэгічнае значэнне.

Напалеон сканцэнтраваў усе свае сілы і актыўна рыхтаваўся да пераправы і прарыву. Яго войскі налічвалі каля 40 тысяч баяздольных салдат і прыкладна столькі ж — неарганізаваных, адсталых. Банапарт умела выкарыстоўваў кожны пралік асобных рускіх ваеначальнікаў, а ў некаторых момантах іх нерашучасць. Аднак нішто ўжо не магло дапамагчы заваёўнікам. Становішча французскай арміі станавілася крытычным. Развязка наступіла 17 (29) лістапада. Напалеон здолеў пераправіць толькі 20 тысяч чалавек. Астатнія войскі, артылерыю, абозы, адстаўшых ён быў вымушаны пакінуць, пачаўшы спальваць масты і знішчаць пераправы. У выніку рашучых атак рускіх войск і артылерыйскага агню, паспешліва адступаўшыя французы таксама неслі прыкметныя страты. Ад Вялікай арміі ворага засталося ўсяго каля 9 тысяч чалавек, амаль чацвёртую частку якіх складалі афіцэры, маршалы, генералы. Гэта былі тыя кадры, якія спатрэбіліся Напалеону ў яго далейшай вайне.

Такім чынам, на Бярэзіне, па сутнасці, не засталося Вялікай арміі французаў. Тут яна страціла 29 тысяч сваіх воінаў і ўсю артылерыю. Агульныя страты праціўніка перавысілі 50 тысяч. У цэлым стратэгічны план разгрому Напалеона быў выкананы.

ПРЫ адступленні Напалеону ўдалося сабраць асобныя войскі ў Заходняй Беларусі і Літве, умацаваць у арміі парадак. Але ненадоўга. Рускія войскі працягвалі наносіць удары. Да таго ж пачаліся моцныя маразы, што канчаткова дэмаралізавала ворага. Напалеон, які знаходзіўся ў Смаргоні, паспешліва адбыў у Парыж. Ён паступіў таксама як і ў 1799 г. ў Егіпце. Неўзабаве здаліся Вільна, Коўна. Тут загінулі рэшткі Вялікай арміі. Адначасова рускія войскі да канца снежня поўнасцю вызвалілі ўсю Беларусь.

«Вайна закончылася за поўным знішчэннем праціўніка», — пісаў Кутузаў. Пачалося вызваленне Беларусі ад тыраніі Банапарта. «Знішчэнне вялікай напалеонаўскай арміі пры адступленні з Масквы, — зазначыў Ф. Энгельс, — паслужыла сігналам да ўсеагульнага паўстання супраць французскага панавання на Захадзе». Натуральна, беларускі народ унёс дастойны ўклад у агульную перамогу. Дзесяткі тысяч рэкрутаў служылі ў І Заходняй арміі, змагаліся пры Барадзіне. 1812 год назаўсёды ўвайшоў у свядомасць, у гістарычную памяць нашага народа.

**Л. ГАРАНІН,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі.**

---

*Дні культуры на польскай зямлі*

# Шлях да ўзаемаразумення

**У мінулым месяцы ў Еленей Гуры прайшлі Дні культуры Гомельскай вобласці.** Еленегурскае ваяводства, адно з 49 ваяводстваў Польшчы, сустрэла нашу дэлегацыю фарбамі позняй восені і цёплымі прывітаннямі польскіх сяброў.

Ваяводства размешчана на паўднёва-захадзе краіны, у маляўнічым горным масіве. Цэнтр ваяводства — Еленя Гура — атрымаў права горада ў 1288 годзе. Цяпер у ім сто тысяч жыхароў, развітыя сектары прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Культуру нашай Гомельшчыны на брацкай польскай зямлі прадстаўлялі мастацкія калектывы ВА «Гомсельмаш», фабрыкі «Праца», іншыя творчыя саюзы.

Асаблівую цікавасць у маладых палякаў выклікала работа нашага маладзёжнага цэнтра «Дружба». Гэта група, створаная Гомельскім абкомам камсамола, аб'яднала дыскусійны клуб, выканаўцаў аўтарскай песні, мазырскую рок-групу «Адлюстраванне» і відэатэку.

Зразумела, што мяне вельмі цікавіла жыццё студэнтцва ПНР. У Еленей Гуры — чатыры вышэйшыя навучальныя ўстановы. Як правіла, гэта філіялы варшаўскіх і вроцлаўскіх ВНУ. У старажытным паляўнічым замку, а цяпер маладзёжным пансіянаце, прайшла сустрэча са студэнтамі факультэта эканомікі турызму Вроцлаўскай Акадэміі эканамічнай, дацэнтам Ежы Ворвай. Гэта быў семінар актывістаў двух студэнцкіх саюзаў. Дыскусія была цікавай і гарачай. Пытанняў было шмат: якія мэты перабудовы ў СССР? Як да яе адносіцца савецкая моладзь? Ці ёсць гарантыі ў незваротнасці перамен, якія пачаліся ў краіне? Нам было прыемна, што наша новая палітыка заваёўвае давер'е, падтрымку ў асяроддзі польскай моладзі.

Мяне асабіста здзівіў на гэтай сустрэчы такі факт. На двухдзённы семінар прыехалі і студэнты роднага эканамічнага факультэта аднаго са славацкіх гарадоў. Падумалася, а што перашкаджае нам развіваць прамыя сувязі з вучэбнымі цэнтрамі Еленей Гуры і Чэске-Будзеёвіц?

Запомнілася сустрэча на адной з сямейных ферм. Яе гаспадар, член ПАРП, у мінулым інжынер-геадэзіст, заняты вырошчваннем 400 авечак. Яму дапамагаюць жонка, сын і двое нанятых работнікаў. Гаспадарка — эканамічна моцная, але вось ужо дзевяць гадоў фермер працуе без водпуску...

Сустрэчы на польскай зямлі паказалі і тое, што многія маладыя палякі слаба знаёмы з жыццём сваіх савецкіх аднагодкаў, поспехамі нашай краіны. Удзельнікі сустрэч былі аднадушныя — асабістыя кантакты, абмены дэлегацыямі ўмацоўваюць нашу дружбу.

У наступным годзе Дні культуры Еленей Гуры пройдуць у г. Гомелі.

**А. КАСЬЯНЕНКА,**
**дацэнт кафедры навуковага камунізму, ўдзельнік Дзён культуры.**

# АПЕРАЦЫЯ «КРОСНЫ»

Стаяў ціхі зімовы ранак 6 снежня. Хацелася паспаць хоць крыху больш, чым звычайна, адпачыць пасля напружанага працоўнага тыдня. Але «дэсант» на чале з Юрыем Астапенкам, у які ўваходзілі яго сябры — студэнты-гісторыкі 1-га курса Андрэй Злотнікаў, Мікалай Шайдзераў, Уладзімір Кулік, Аляксандр Вянгура, падняўся ўжо ў шэсць гадзін. Хуценька сабраліся, і неўзабаве поезд імчаў хлопцаў да вёскі Ліскі Рэчыцкага раёна. Пакуль што яны нічым асаблівым не выдзяляліся сярод іншых пасажыраў. Аб'ектам павышанай увагі яны сталі на зваротным шляху, пасля таго, як аператыўна дабраліся да вёскі, разабралі на часткі старыя кросны і даставілі іх на плячах да поезда. Колькі было здзіўленых позіркаў, пытанняў, рэплік! Старыя жанчыны ўспаміналі сваю маладосць, расказвалі, як яны самі калісьці працавалі на такіх станках. Не абышлося і без прыгод. Цяжкавата было цягнуць драўляныя брусы, калі сышлі з поезда на прыпынку «Гомель-цотны». Але аперацыя завяршылася паспяхова.

**Больш пяцідзесяці гадоў прастаялі кросны ў доме Вольгі Якаўлеўны Астапенка, маці Юрыя. Шмат давялося ім папрацаваць у цяжкія** 30—50-я гады... А цяпер яны будуць служыць новай высакароднай мэце — выхоўваць любоў і павагу да мінулага нашага роднага краю. Адразу цясней стала ў невялікім пакойчыку нашага музея, але ж і куды цікавей!

**У. БАГАМОЛЬНІКАЎ,**
**дырэктар археалагічнага музея ГДУ.**



**НА ЗДЫМКУ: за ўстаноўкай кроснаў студэнты У. Кулік і А. Вянгура.**
**Фота А. Ульянкінай.**

# ПОСПЕХ ТРЫО «ТАЛІСМАН»




У маладым горадзе нафтахіміі — Наваполацку адбыўся II рэспубліканскі фестываль савецкай маладзёжнай песні. У ім прыняў удзел і калектыў студэнцкага клуба «Маладосць» ГДУ — трыо «Талісман».

Назву гэтую рабяты выбралі не выпадкова, у ёй адлюстроўваецца іх адданасць песні і музыцы. Яны працуюць па прынцыпу: ва ўсім выкладвацца да канца. Так, нібы другой магчымасці ўжо не будзе...

Першы іх канцэрт адбыўся ў снежні 1985 года. Дуэт у саставе студэнтак матэматычнага факультэта Ларысы Міхаленка і Святланы Касаевай спадабаўся гледачам. **З таго часу ён стаў выступаць на ўсіх канцэртах, конкурсах і музычных фестывалях, якія праводзіліся ва універсітэце. Раслі** і музычныя запатрабаванні — гітара **і фартэпіяна ўжо не задавальнялі. З прыходам Алега Сацюка, які іграе на скрыпцы, з авалоданнем** ігрой на акардэоне, піяноле, аранжыроўка іх песень набыла большую арыгінальнасць.

Праз год калектыў стаў лаўрэатам абласнога конкурсу самадзейнай песні, дыпламантам конкурсу палітычнай песні, былі граматы і дыпломы. А што зараз? Новая вяршыня або толькі прыступка да яе?

І вось доўгачаканы дзень адкрыцця фестывалю, у якім прынялі ўдзел 42 калектывы з усёй Беларусі. Вельмі цёпла, гасцінна віталі палаўчане сваіх гасцей.

Як на любым фестывалі, публіка сабралася самая разнастайная. Некага прывяла ў залу простая зацікаўленасць, але расчараваных не было. Большасць выканаўцаў выступіла арыгінальна, песні іх запомніліся. Хаця галоўнае ў самым фестывалі, напэўна, было не гэта, а энтузіязм, творчы настрой, з якім яго рыхтавалі ўсе разам: музыканты, выканаўцы, мастакі.

Уявіце сабе вялізную залу Палаца нафтавікоў. І на працягу трох дзён яна была перапоўнена. Трыо нашага універсітэта выступала ў першы ж дзень конкурсу. І зноў, нібы ў першы раз, вялікае хваляванне і адна «замова»: «Хаця б не правяліцца!». А пасля паспяховага выступлення — апладысменты і ўсмешкі, выклік на «біс» і кветкі.

— Мы зусім не спадзяваліся, што пераможам, — гаворыць Ларыса Міхаленка, — гэта было вельмі нечакана для нас.

«Талісман» выканаў на фестывалі тры песні: «Пасляпераможны вальс» А. Разенбаума, «На прыстані» (музыка Нікіціна на вершы Разанава) і «Калыханка» (муз. Паулса на вершы Петэрыса).

Пасля абодвух тураў конкурсу лаўрэатамі былі прызнаны: сярод вакальных груп — трыо «Талісман» (ГДУ), сярод рок-груп — «Квінта» з Мінскага інстытута культуры. Прыз сімпатый гледачоў атрымала мінская група «Метро».

Пасля падвядзення вынікаў адбыўся гала-канцэрт, на якім выконваліся лепшыя нумары фестывалю. У ім разам з іншымі выканаўцамі прынялі ўдзел трыо «Талісман» і ВІА «Галасы Палесся» (ДК «Гомельдрэў»).

Перамога нашых студэнтаў у Наваполацку не з'яўляецца падагульняючым вынікам творчасці маладых выканаўцаў. Гэта іх першыя, але дастаткова ўпэўненыя крокі. Другая па ліку творчая сустрэча трыо з гледачамі, якая адбудзецца 22 снежня г. г. у актавай зале ГДУ, прымусіць нас больш уважліва прыглядзецца да гэтага калектыву, услухацца ў яго новыя песні.

Поспехаў вам, рабяты, у вашай нялёгкай, але цудоўнай працы. Памятайце, што поспех спадарожнічае толькі тым, хто не спыняецца на дасягнутым, а ідзе далей, каб скараць вяршыні творчасці.

**НА ЗДЫМКУ: трыо «Талісман».**

Тэкст і фота **А. Ульянкінай.**

*КУРЭННЕ—ВОРАГ ЗДАРОЎЯ*

# АБ'ЯВІМ РАШУЧЫ БОЙ

Дваццаць гадоў я працую ў вышэйшай школе і з усёй пераканаўчасцю магу сказаць: барацьба супраць курэння ў ВНУ практычна не вядзецца. Мы дакладна не ведаем колькасці студэнтаў, якія кураць, тых звестак, што паступаюць аб гэтым у Мінвуз СССР. Але, думаецца, справаздачы зусім не адпавядаюць сапраўднасці. Армія курыльшчыкаў ніяк не змяншаецца.

Зусім бессаромна кураць і выкладчыкі нашага універсітэта — на лесвічных пляцоўках, у калідорах, у кабінетах і аўдыторыях і нават у час вучэбных заняткаў. Так, так, іншы раз даводзіцца назіраць і такое. Трэба прама прызнаць — загад рэктара універсітэта аб строгай забароне курэння не выконваецца. Зайдзіце, напрыклад, у корпус геалагічнага факультэта і адразу адчуеце: усё тут насычана тытунёвым дымам.

Вельмі горка бачыць выкладчыкаў-фізкультурнікаў, трэнераў на спартыўных пляцоўках і стадыёнах, якія кураць таксама. А гэта ж іх найпершы абавязак — усталёўваць здаровы лад жыцця, актыўна змагацца з усім тым, што шкодзіць нашаму здароўю.

Як жа адносяцца кіраўнікі ВНУ і міністэрстваў да курэння? Зусім цярпіма, па сутнасці, абыякава. Мне невядомы ні адзін выпадак асуджэння выкладчыкаў за курэнне ў сценах навучальнай установы. Безумоўна, тут неабходны дзейсныя меры. Таму прапаную палажэнне аб парадку замяшчэння пасад і атэстацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу ў вышэйшых навучальных установах дапоўніць пунктам аб курэнні.

Размова ідзе не аб тым, дапускаць ці не дапускаць да работы ва універсітэтах, інстытутах асістэнтаў, дацэнтаў, прафесараў, якія кураць — надта глыбокія корні гэтай эпідэміі. Пры конкурсным выбранні пры іншых роўных паказчыках трэба аддаваць перавагу — і на ўвесь голас! — тым, хто не курыць. Мэтазгодна ўлічыць гэту акалічнасць і ў інструкцыі аб парадку назначэння і выплаты стыпендый студэнтам. Рэкамендую абмежаваць, напрыклад, прывілеі (першачарговасць, павышэнне размеру стыпендыі) для студэнтаў, якія кураць. І гэта будзе гуманна. Хочаш атрымаць поўную стыпендыю, быць здаровым — кінь курыць.

Здароўе нашай моладзі выклікае асаблівую заклапочанасць. Як перасцерагчы юнакоў і дзяўчат ад захворвання ракам лёгкіх, інфаркта, язвы страўніка — асноўных захворванняў курыльшчыкаў? Неабходна памятаць і аб тым, што курыльшчыкі ўяўляюць сур'ёзную небяспеку і для тых, хто знаходзіцца з імі побач, у накураных памяшканнях. Яны таксама становяцца ахвярамі пералічаных хвароб. Магчыма, мэтазгодна ў вучэбных установах у выглядзе вопыту ўвесці адпаведныя курсы з тым, каб дапамагчы курыльшчыкам адмовіцца ад сваёй дрэннай звычкі, прапагандаваць стварэнне студэнцкіх груп, дзе б не было ніводнага курыльшчыка. Трэба абмежаваць або зусім забараніць продаж тытунёвых вырабаў паблізу вучэбных карпусоў ВНУ і асабліва сярэдніх школ.

Усім вядома, што большасць юнакоў і дзяўчат пачынаюць курыць у школьным узросце. Пры паступленні ў ВНУ, бясспрэчна, ацвярозваючае ўздзеянне на іх зрабіла б размова ў прыёмнай камісіі на прадмет курэння. З першых крокаў да набыцця прафесіі трэба глыбока ўсвядоміць: цыгарэта і дыплом — рэчы несумяшчальныя для педагога, урача, трэнера. З няменшым абгрунтаваннем у гэты спіс можна ўключыць работнікаў нашай міліцыі, афіцэраў-выхавацеляў маладых воінаў.

Можна толькі вітаць заяву міністра аховы здароўя СССР Я. І. Чазава аб распрацоўцы праграмы па барацьбе з курэннем. Сапраўды, барацьба з гэтым вялікім злом (падумаць толькі: у нас у краіне больш 70 млн. курыльшчыкаў) павінна весціся шырокім фронтам — усімі ведамствамі і перш за ўсё міністэрствамі асветы, вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, аховы здароўя, абароны. Неабходна катэгарычна забараніць усякую прапаганду курэння, нават у асабістых узаемаадносінах. Некаторыя могуць запярэчыць: у нас, маўляў, ніякой такой прапаганды даўно няма. А горы цыгарэт каля кас прадуктовых магазінаў, маляўнічыя папяросныя каробкі, выключная даступнасць набыцця, у тым ліку і па цане, невысокай нават для школьнікаў малодшых класаў?...

У апошні час наш друк, тэлебачанне, радыё (трэба аддаць ім належнае) часта паведамляюць аб значных поспехах у барацьбе супраць курэння у многіх капіталістычных краінах. Толькі мы раўнадушна мірымся з гэтым злом грамадства. Неразумна!

**В. ВАХРУШАЎ,**
**прафесар, загадчык кафедры мінералогіі і агульнай геалогіі.**

# ЛЮБІЦЕ І ШАНУЙЦЕ ПРЫРОДУ

Кнігі пра жывёл выклікаюць пастаянную цікавасць чытачоў усіх узростаў, і асабліва моладзі, якая адкрывае для сябе цудоўны свет прыроды. І сярод іх асаблівае месца належыць Чырвоным кнігам, бо яны сумірують звесткі аб тых відах, якія па самых розных прычынах сталі рэдкімі і якім пагражае небяспека знішчэння. Сярод іх чытачу варта выдзеліць своеасаблівы энцыклапедычны даведнік «Па старонках Чырвонай кнігі».

Кожны від жывёліны — гэта непаўторная з'ява прыроды, вынік доўгага эвалюцыйнага развіцця. Адны жывёлы былі поўнасцю знішчаны з-за смачнага мяса, другія — з-за прыгожага футра, трэція — таму, што, з'яўляючыся драпежнікамі, складалі канкурэнцыю чалавеку ў здабычы паляўнічых трафеяў. І тое, што ўйшло з вымершымі жывёламі, уйшло назаўсёды. А з гэтым становіцца бяднейшай прыгажосць акружаючага нас свету.

Шырокія слаі насельніцтва, усе, хто любіць прыроду, хто так ці інакш умешваецца сваімі дзеяннямі ў прыродныя працэсы, павінны валодаць высокай свядомасцю, вялікай экалагічнай культурай, разумець, што абыякавыя адносіны да прыроды і яе багаццяў непазбежна будуць адмоўна ўплываць на самога чалавека.

Хацелася б выказаць спадзяванне, што прапаноўваемы энцыклапедычны даведнік акажацца карысным і выкліча цікавасць у шырокага кола чытачоў.

Чытачы, несумненна, атрымаюць вялікае задавальненне, калі прачытаюць кнігу вядомага савецкага заолага і пісьменніка Я. П. Спангенберга «Сустрэчы з жывёламі». Яна раскажа пра цудоўны свет прастораў нашай краіны, захапляльную, нярэдка вельмі цяжкую экспедыцыйную работу, памятныя сустрэчы з людзьмі і жывёламі. Жанр кнігі вызначыць цяжка. Гэта не дарожныя нататкі і дзённікі, хаця многае ў ёй напісана на іх аснове і кампазіцыйна яна пабудавана па геаграфічнаму прынцыпу. Гэта не проста расказы аб прыродзе і жывёлах. Думаецца, што галоўны герой гэтай кнігі — нешта цяжкаўлоўнае, што ўбірае ў сябе і людзей, і прыроду, і жывёл, тое бясконца дарагое кожнаму, што можна назваць духам роднай краіны, духам Радзімы.

З цікавым, загадкавым светам насякомых можна пазнаёміцца па кнізе Л. С. Чумакова «Свет шасціногіх». Колькасць насякомых, якія жывуць на Зямлі, вялікая. Па колькасці відаў шасціногія таксама пераўзыходзяць іншыя групы жывёлін, складаючы 70% разнастайнасці жывёльнага свету.

Свет насякомых багаты і разнастайны. І чалавек павінен адносіцца да яго з любоўю, таму што, калі б шасціногіх не стала, то «зямлю магла б напаткаць катастрофа: знікла б большасць відаў жывёл і раслін, людзі страцілі б крыніцы харчавання, сыравіны, знізілася б урадлівасць глебы». Мы жывём па суседству з шасціногімі, іх здзіўляючым светам. Дык давайце адносіцца да іх беражліва!

**М. ГАПЕЕВА,**
**загадчыца аддзела бібліятэкі ГДУ.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат і ўвесь калектыў матэматычнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне дэкану гэтага факультэта дацэнту СЕЛЬКІНУ Міхаілу Васільевічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.**

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктората, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

АЗ 44779
Аб'ём — 1 друк. арк.
Тыраж 2000 экз. Заказ 977.